*УДК 392.1(476.2-37-21Рэчыца)*
**Е. Р. Вілюра**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***
# МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ ЖЫХАРОЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ РЭЧЫЦЫ)

*У артыкуле разгледжаны радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў на матэрыяле фальклору, запісанага ўласна аўтарам у г. Рэчыцы Гомельскай вобласці. У кожным з перыядаў радзіннахрэсьбіннай абраднасці аналізуюцца асобныя структурныя кампаненты і звязаныя з імі народныя вераванні. Навізну прапанаванага даследавання складаюць аўтэнтычныя матэрыялы, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.*

Самыя важныя падзеі ў зямным жыцці чалавека – нараджэнне, вяселле і пахаванне. Варта адзначыць, што звычайна абрады, звязаныя з нараджэннем чалавека, адбываюцца ў цесным сямейным коле. Вялікую ролю ў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці адыгрывала бабка-павітуха,



якая аказвала вялікую дапамогу жанчыне-парадзісе, а таксама рыхтавала для хрэсьбіннага застолля абрадавую страву – «бабіну кашу». Звернемся спачатку да прыкмет і павер‘яў, якімі быў напоўнены дародавы перыяд. Фактычны матэрыял [1; 2], запісаны ў горадзе Рэчыца Гомельскай вобласці, дазваляе размеркаваць іх па асобных тэматычных групах. Да першай, найбольш пашыранай, можна аднесці тыя з іх, якія звязаны са знешнім выглядам нованароджанага. Цяжарная жанчына імкнулася выконваць усе правілы, згодна з якімі можна было, паводле народных вераванняў, не дапусціць тых дзеянняў, якія маглі б справакаваць нараджэнне дзіцяці з фізічнымі недахопамі. Каб не пашкодзіць знешняму выгляду немаўляці, жанчынапарадзіха асцерагалася дакранацца да свайго твару, калі з‘яўлялася сведкай пажару: «*Нельзя ничего делать як пажар, нельзя трогать ни за лицо, ни за руки, бо буде ребенок з пятнами или з радимым пятном*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н. і Пятравец Святланы Сямѐнаўны, 1954 г. н.). Забаранялася, зыходзячы з мясцовых павер‘яў, цяжарнай жанчыне хадзіць у тых месцах, дзе сустракаліся слупы, аркі, нельга было пераскокваць праз ямы: «*Беременным нельзя проходить через арки и под столбами с подпорками, прыгать через яму и канаву нельзя*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1953 г. н. і Пятравец Святланы Сямѐнаўны, 1954 г. н.). Хоць і няма тлумачэнняў семантыкі прыведзеных павер‘яў, аднак можна меркаваць, што гэтыя забароны таксама былі скіраваны на нараджэнне здаровага дзіцяці, без якіх-небудзь фізічных заганаў.

У традыцыйнай культуры беларусаў, у прыватнасці – жыхароў Рэчыцы, устойлівым з‘яўляецца павер‘е, звязанае з імкненнем жанчыны нарадзіць знешне прыгожае дзіця, менавіта таму ў народзе і раілася: «*Не смотреть на некрасивых людей, а чтобы ребенок был красив, нужно смотреть на красивых людей*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).

Асобнае месца ў сістэме мясцовых прыкмет і павер‘яў займаюць і тыя з іх, што былі звязаны са святамі і з забаронамі працаваць жанчыне-парадзісе, каб гэта адмоўна не сказалася на знешнім выглядзе дзіцяці: «*Беременная не должна ничего шить, резать и латать, особенно во время Святок и в Семицкую неделю, не то у ребенка либо «заплата» на щеке будет (родимое пятно), либо ему путь в этот мир будет «зашит» – здесь речь идет об острых предметах – ноже, ножницах, иголке. Если, не дай Бог, беременная уколется или поранится, она,
естественно, испытает чувство испуга, а это сказывается на состоянии ребенка. Не исключена и связь между кожей матери и кожей ребенка*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).



Аснову другой тэматычнай групы прыкмет і павер‘яў складаюць паводзіны жанчыны-парадзіхі. У мясцовай традыцыі, у адрозненне ад іншых рэгіянальна-лакальных запісаў, забарона для цяжарнай жанчыны дакранацца да свойскіх жывѐл асэнсоўвалася ў дачыненні да фарміравання рысаў характару немаўляці. Каб нованароджаны быў добрым чалавекам, забаранялася будучай маці біць іх нагамі: «*Нельзя пинать ногами ни собак, ни котов, потому что это плохая примета (чтобы ребенок родился добрым и не агрессивным*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).

Іншыя прыклады звестак таксама пацвярджаюць агучаны тэзіс уплыву маральна-этычных норм паводзін жанчыны-парадзіхі на фарміраванне характару дзіцяці: «*Беременная не должна есть тайком: ребенок родится пугливым или вором. Эта примета направлена на защиту беременных: еда тайком, в темноте, на ходу и не полезна, и может привести к внезапному испугу. Посредством приметы*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*пытались влиять и на отношение мужа к беременной: ее повышенный аппетит надо воспринимать доброжелательно*» (запісана ад Пятравец Святланы Сямѐнаўны, 1954 г. н.).
Да асобнай групы павер‘яў, звязаных з захаваннем плода, варта аднесці наступнае: «*Беременной перед родами стричь волосы нельзя: ребенок может родиться мертвым» – в волосах сокрыта жизненная сила человека»* (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).
Што да іншых міфалагічных уяўленняў, звязаных з валасамі, то, паводле ўспамінаў інфармантаў, надзвычай важнымі былі народныя рэкамендацыі, скіраваныя на наступныя парады: не стрыгчы валасы дзіцяці і нават не расчэсваць іх яму да года: «*Ребѐнка до года не рекомендуется даже причесывать, не только стричь (лишь при крещении выстригалась прядка волос для закладывания в воск). Так что есть все основания прислушаться к этому поверью*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).
З валасамі і пазногцямі былі звязаны таксама народныя вераванні, згодна з якімі можна было забяспечыць высокі рост і прыгожы голас нованароджанага, пра што і сведчаць наступныя ўласна запісаныя звесткі: «*Не надо обрезать ногти и волосы до годика, чтобы ребѐнок высоким вырос*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).
Што да прыгажосці голасу, то «*чтобы у ребѐнка был красивый голос, нужно слушать людей с красивым голосом*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).
Як згадвалася раней, цяжарная жанчына імкнулася выконваць усе правілы, каб не дапусціць тых дзеянняў, якія маглі б справакаваць нараджэнне дзіцяці з фізічнымі недахопамі: «*Если женщина вот-вот родит или уже рожает, об этом нельзя говорить посторонним,*



*чтобы не сглазить мать и ребѐнка*» (запісана ад Пятравец Святланы Сямѐнаўны, 1954 г. н.).
Важным момантам у структуры радзінна-хрэсьбіннай абраднасці быў выбар на ролю бабкі, кума і кумы, запрашаючы якіх бацькі нованароджанага абавязкова павінны былі прынесці ім хлеб: «*Когда зовут*
*на крестины бабку и кумовьев, родители ребѐнка приносят им хлеб, если те, кому они принесли хлеб, приняли его, то можно считать, что они согласны стать кумовьями*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.). Напрыклад, кумам і кумой звычайна бралі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сяброў, якія не былі ў адным шлюбе альбо выбіралі кагосьці з родных. Гэтыя ганаровыя асобы, як правіла, прымаюць удзел у хрэсьбінах, і «*когда крестят ребѐнка в церкви, кум должен заплатить за этот обряд, а кума должна одеть ребѐнка*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).

У мясцовай традыцыі было прынята адорваць падарункамі і кума, і куму: «*Подарки на крестины должны подарить и куму, и куме*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.). Госці павінны былі прыйсці на хрэсьбіны з падарункамі для нованароджанага і яго маці: «*Всегда на крестины дарили подарок не толькі ребѐнку, но и роженице*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.). Устойлівай была традыцыя хрышчэння дзіцяці, з якой было звязана наданне царкоўнага імя немаўляці: «*Когда крестили в церкви, ему предпочитали давать другое церковное имя, чтобы посторонние люди его не знали и не могли его сглазить*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).

У сваю чаргу бабка-павітуха рыхтавала страву, якую называлі «*бабінай кашай*». Кульмінацыяй радзінна-хрэсьбіннага застолля з'яўляўся абрад разбівання гаршка з кашай. Гэты рытуал звычайна выконваў кум: «*Кутья – гэта бабкина каша. Бабка-павитуха варила кутью, и за эту кашу происходи торг, и по традиции самую большую сумму должен был выделить крестный. После завершения торга глава семейства (отец или дедушка) должен разбить этот горшок с кашей, чтобы выросший ребенок быстре женился или вышел замуж*» (запісана ад Яўланавай Марыі Сямѐнаўны, 1953 г. н.).

Выкананне рытуалаў, звязаных з рознымі перыядамі радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, а таксама адпаведных прыкмет і павер'яў была скіравана на засцярогу нованароджанага ад звышнатуральнага ўздзеяння варожых містычных істот, а таксама забеспячэнне здароўя і будучага дабрабыту немаўляці. Прадстаўленыя ў рабоце палявыя запісы фальклорных звестак упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак і ўзбагачаюць рэгіянальную радзінна-хрэсьбінную традыцыю Гомельшчыны.



У артыкуле выкарыстаны матэрыялы навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры установы адукацыі ―Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны‖.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**Спіс літаратуры**

1 Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўт.-ўкл. : В. С. Новак [і інш.]. – Гомель : Барк, 2013. – 380 с

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ